УДК 94 (476) “18/19” (072)

# ТРАДЫЦЫІ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ НОВАГА І НАВЕЙШАГА ЧАСУ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

***А.Г. Каханоўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, Kohanovsky@bsu.by*

У артыкуле дадзены аналіз амаль стогадовай традыцыі вывучэння гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ў сценах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе адбылося станаўленне ўласнабеларускай гістарычнай школы і гісторыі Беларусі як самастойнага аб’екта даследавання. Паказана тэматыка даследаванняў, фарміраванне навуковых школ. Асаблівы акцэнт зроблены на 25-гадовы перыяд дзейнасці кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу (з 1994 г. і да сёняшняга дня).

***Ключавыя словы:*** *гісторыя Беларусі новага і навейшага часу; кафедра; гістарычны факультэт; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; гістарыяграфія; традыцыі вывучэння.*

# ТРАДИЦИИ ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ НОВОГО И НОВЕЙШЕГО ВРЕМЕНИ В БЕЛОРУССКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ УНИВЕРСИТЕТЕ

***А.Г. Кохановский***

*Белорусский государственный университетет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Kohanovsky@bsu.by*

В статье дан анализ почти столетней традиции изучения истории Беларуси нового и новейшего времени в стенах Белорусского государственного университета. Здесь произошло становление собственно белорусской исторической школы и оформление истории Беларуси как самостоятельного объекта исследования. Показана тематика исследований, формирование научных школ. Особый акцент сделан на 25-летнем периоде деятельности кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени (с 1994 г. и до сегодняшнего дня).

***Ключевые слова:*** *история Беларуси нового и новейшего времени; кафедра; исторический факультет; Белорусский государственный университет; историография; традиции изучения.*

# TRADITIONS OF STUDYING MODERN AND CONTEMPORARY HISTORY OF BELARUS AT THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

***A. Kakhanouski***

*Belarusian State University, 4, Nezavisimosti avenue, 220030, Minsk, Belarus, Kohanovsky@bsu.by*

The article analyzes the almost century-old tradition of studying modern and contemporary history of Belarus at the Belarusian State University. The formation of properly the Belarusian historical school and the development it as an independent object of the research took place there. The author goes on to show the areas of research and the emergence of scientific schools of thought. The author draws particular attention to the 25-year period of activity of the Department of Modern and Contemporary History of Belarus (since 1994 up to the present day).

***Key words:*** *modern and contemporary history of Belarus; the department; the Faculty of History; the Belarusian State University; historiography; traditions of studying.*

З кафедрай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу звязваецца шматпланавае вывучэнне адпаведнага перыяду айчыннай гісторыі не толькі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, але і ў краіне. На сёняшні дзень гэта буйнейшы навуковы, адукацыйны і экспертны цэнтр у сваёй сферы. Мінула 25 год з часу стварэння кафедры як асобнага падраздзялення гістарычнага факультэта, аднак вывучэнне гісторыі Беларусі новага і навейшага часу мае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце амаль стогадовую традыцыю. Пачатак быў пакладзены першымі прафесарамі-гісторыкамі ўніверсітэта. Менавіта з адкрыццём БДУ звязана інстуцыяналізацыя вывучэння гісторыі ў Беларусі, пачатак станаўлення ўласнабеларускай гістарычнай школы і гісторыі Беларусі як самастойнага аб’екта даследавання. Да аналізу сацыяльных працэсаў у Беларусі ў пачатку XX ст. звяртаўся першы рэктар БДУ, выдатны гісторык-славіст У.І. Пічэта [24]. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі сістэмны аналіз сацыяльна-эканамічных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ва ўзаемадачыненні розных іх складаючых зрабіў М.В. Доўнар-Запольскі [7]. Сацыяльна-палітычныя працэсы ў Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. разглядалі У.М. Ігнатоўскі [9], К.І. Кернажыцкі [15],

В.К. Шчарбакоў [29] і інш. Не без шаблонаў, характэрных для 30–50-х гг. XX ст. з празмернай ўвагай да развіцця рабочага і сялянскага руху, сцвярджэннем непазбежнасці рэвалюцыйных пераўтварэнняў, але ўсё ж змястоўны матэрыял аб сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі XIX ст., грамадска-палітычных і этнакультурных працэсах утрымліваюць даследаванні Д.А. Дудкова [8], М.Б. Фрыдман [26], і інш.

Інстытуцыянальна ў 40 – 80-я гг. мінулага стагоддзя вывучэнне гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце было звязана, перш за ўсё, з кафедрай гісторыі БССР, а таксама з навуковымі інтарэсамі асобных выкладчыкаў кафедр гісторыі СССР дасавецкага перыяду і гісторыі СССР эпохі сацыялізму. Тут бярэцца пад увагу толькі праца кафедр грамадзянскай гісторыі, без уліку гісторыка-партыйнай навукі, якая была сферай інтарэсаў кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Інфармацыйны паток назапашвання навуковых ведаў па гісторыі Беларусі ў 40 – 80-я гг. XX ст. быў непараўнальна меншым, чым на сучасным этапе. Выхад з друку кожнай навуковай манаграфіі па гісторыі Беларусі ў гэты перыяд быў падзеяй. Пераважная частка даследаванняў праводзілася па пытаннях сацыяльна-эканамічнай развіцця, гісторыі класавай барацьбы і сацыяльных канфліктаў, сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, гераічнай барацьбы беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у меншай ступені – развіцця культуры. Навуковыя мерапрыемствы, канферэнцыі праводзіліся параўнальна рэдка. На гістарычным факультэце БДУ – не часцей 1–2 у год. Рэдкімі былі выпадкі падрыхтоўкі і публікацыі уласных навучальных дапаможнікаў. За 70 – 80-я гг. XX ст. іх колькасць не перавысіла дзесятка. Такая тэндэнцыя была характэрнай для ўсёй гістарычнай навукі і адукацыі ў БССР.

Кафедра гісторыі БССР, якая працавала ў 1943–1949 гг. і аднавіла сваю дзейнасць у 1958 г., уяўляла сабой невялікае падраздзяленне гістарычнага факультэта. Калектыў яе складалі практычна нязменна на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў 6 – 8 выкладчыкаў, большасць з якіх у сваіх навуковых публікацыях закраналі гісторыю Беларусі новага і навейшага часу. З 1958 да 1975 г. кафедру ўзначальваў прафесар Л.С. Абецэдарскі, які стаў ініцыятарам стварэння першага школьнага падручніка па гісторыі Беларусі. Яго выданне ў рэаліях савецкай ідэалагічнай сістэмы, калі ішло змаганне з любымі магчымымі праявамі беларускага нацыяналізму, было сапраўным учынкам. Выкладчыкі кафедры, факультэта ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы абагульняючых акадэмічных выданняў па гісторыі Беларусі [5]. Пасля смерці Л.С. Абецэдарскага кароткі тэрмін абавязкі загадчыка кафедры выконваў прафесар А.П. Ігнаценка, які ў той час меў праблемы з зацвярджэннем доктарскай дысертацыі. У ВАК СССР адмоўны водгук на яго работу даў выдатны даследчык М.М. Улашчык, не згодны з канцэптуальнымі падыходамі саіскальніка. Пазней дысертацыя А.П. Ігнаценкі была зацверджана, аднак загадчыкам кафедры стала прафесар В.У. Чапко (1978–1983 гг.), якая вядомая як аўтар некалькіх манаграфій, прысвечаных сацыяльна-эканамічнаму развіццю беларускай вёскі і горада ў першай палове XIX ст. У гэты час на кафедры працавалі 3 дактары гістарычных навук, прафесары (В.У. Чапко, А.П. Ігнаценка, Д.Б. Мельцар), 4 кандыдаты гістарычных навук, дацэнты (Я.Ю. Несцяровіч, І. В. Марчанка, В.Р. Рудкін, В.А. Цяплова) і 1 старэйшы выкладчык (А.Л. Абецэдарская). Па сумяшчальніцтву да вядзення семінарскіх заняткаў прыцягваліся У.А. Сосна, А.У. Кузняцова. Прафесар А.П. Ігнаценка займаўся вывучэннем гісторыі Беларусі перыяду сярэднявечча, пакінуў памяць аб сабе як аб вельмі скрупулёзным даследчыку, аўтарытэт і веды якога прызнавалі нават яго нядобразычліўцы. Ён амаль кожны дзень праводзіў у кнігасховішчах беларускага аддзела былой “ленінкі”. Па выкладаемых вучэбных дысцыплінах дзейнасць прафесара Д.Б. Мельцара некалькі выходзіла за межы традыцыйнай сферы інтарэсаў кафедры. Ён чытаў лекцыі па гісторыі паўднёвых і заходніх славян, вывучаў беларуска-балгарскія культурныя сувязі, праводзіў на факультэце навуковыя форумы славістаў, выконваў на грамадскіх пачатках абавязкі намесніка дэкана па навуковай рабоце. Дацэнт Я.Ю. Несцяровіч вывучаў пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, уваходжання БССР у склад СССР, быў шматгадовым неафіцыйным дарадчыкам прафесара А.П. Ігнаценкі ў яго навукова-педагагічнай і адміністрацыйнай дзейнасці. У сферу навуковых інтарэсаў дацэнта В.Р. Рудкіна ўваходзілі праблемы станаўлення сацыяльнай работы ў БССР у міжваенны перыяд. Сярод старажылаў кафедры і факультэта, студэнтаў тых гадоў ён пакінуў аб сабе след як аб цудоўным чалавеку. Дацэнт І.В. Марчанка быў ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, франтавіком. Доўгі час служыў выкладчыкам ваеннай кафедры БДУ,

палкоўнік. Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі і выхаду ў адстаўку працаваў да сваёй смерці ў 1987 г. на кафедры гісторыі БССР. Вывучаў пытанні станаўлення і развіцця ваенна-патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі. Дацэнт В.А. Цяплова, прыйшоўшы на кафедру ў сярэдзіне 70-х гг. ХХ ст., пераключылася на пытанні гісторыі культуры Беларусі, вывучэння ўплыву ідэй Асветніцтва.

У 1983 г. кіраўніцтва кафедрай гісторыі БССР перайшло да прафесара І.О. Царук – выдатнага арганізатара гістарычнай адукацыі і навукі, якая на пасадзе дэкана на працягу 13 год узначальвала гістарычны факультэт. Менавіта ў гады працы І.О. Царук адбываецца імклівы рост кафедры, павялічваецца яе штат. У калектыве з'яўляюцца маладыя даследчыкі (С.М. Ходзін, Л.Л. Бельская). У 1988 г. пры кафедры была створана навукова-даследчая лабараторыя, перад якой былі пастаўлены задачы навуковага асэнсавання гістарычнай спадчыны Беларусі, што ў той час выклікала вялікую зацікаўленасць у беларускім грамадстве. Стварэнне НДЛ гісторыі Беларусі стала першым вопытам на гістарычным факультэце ў асваенні асобнага бюджэтнага фінансавання навуковай дзейнасці. У яе штаце працавалі навуковыя супрацоўнікі А.Г. Каханоўскі, В.С. Касмылёў, А.І. Кушнір, Э.С. Дубянецкі. На кафедры пашыраецца аспірантура. Яшчэ ў сярэдзіне 80-х гг. па спецыяльнасці 07.00.02 – гісторыя СССР для падрыхтоўкі кадраў праз аспірантуру выдзялялася як правіла адно месца раз у 2–3 гады, то на мяжы 80 – 90-х гг. – ужо 2–3 месцы ў год.

У 1989–1994 гг. кафедрай гісторыі Беларусі загадваў прафесар А.П. Ігнаценка. Будучы "феадалам" па прафесійных навуковых інтарэсах, ён вельмі актыўна адгукаўся ў друку па пытаннях станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў ХХ ст., выкарыстання нацыянальнай сімволікі. Ва ўмовах, калі змяняліся грамадска-палітычныя ўстоі, свядомасць людзей, А.П. Ігнаценка застаўся верным сваім ранейшым перакананням, аднак не перашкаджаў навуковаму пошуку выкладчыкаў кафедры, падтрымліваў палеміку, якая нярэдка ўзнікала на пасяджэннях. У пачатку 90-х гг. на кафедру перайшлі працаваць прафесар П.І. Зялінскі, дацэнты Л.А. Жылуновіч, Ю.Л. Казакоў. Сферай навуковых інтарэсаў прафесара П.І. Зялінскага на працягу яго жыццёвага шляху было вывучэнне палітычнай барацьбы ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд [10]. Будучы непасрэдным удзельнікам выпрабаванняў ядзернай зброі на Тоцкім палігоне ў 1954 г., у апошнія два дзесяцігоддзі свайго жыцця (да часу смерці ў 2019 г.) П.І. Зялінскі шмат сіл аддаваў дзейнасці грамадскага аб'яднання ветэранаў падраздзяленняў асаблівай рызыкі, падрыхтаваў да друку некалькі кніг для ўзнаўлення памяці аб нашых суайчынніках, якія воляй лёсу мелі дачыненне да стварэння і выпрабаванняў ядзернай зброі ў СССР. У гісторыі кафедры прафесар П.І. Зялінскі застаўся як чалавек, да якога хінуліся студэнты і аспіранты. Яго з цеплынёй і павагай узгадваюць калегі, асабліва пасяджэнні кафедры, дзе ён з гумарам абыходзіў многія напружаныя моманты абмеркаванняў. Дацэнт Л.А. Жылуновіч займаўся на кафедры пытаннямі гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, дацэнт Ю.Л. Казакоў пасля змены месца сталай працы пераарыентаваўся з палітычнай гісторыі Беларусі ХХ ст. на канфесійную гісторыю Вялікага княства Літоўскага.

У 1994 г. кафедра была падзелена на дзве і як самастойная структурная адзінка гістарычнага факультэта пачынае працаваць кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу (загадчык – прафесар П.І. Брыгадзін). Ад самага пачатку кафедра актыўна расце, пашыраецца сфера яе навуковых інтарэсаў. Вызначыліся прыярытэтныя кірункі даследаванняў – гісторыя беларускай дзяржаўнасці, сацыяльная гісторыя XIX – пачатку ХХ ст., гісторыя Вялікай Айчыннай вайны. На кафедру ў гэты час прыйшлі працаваць прафесары У.Ф. Ладысеў, У.М. Міхнюк, дацэнты У.І. Адамушка, В.С. Касмылёў, выкладчык А.М. Лукашэвіч і інш. Прафесар П.І. Брыгадзін мае шырокі дыяпазон навуковых інтарэсаў. Доктарская дысертацыя яго была прысвечана дзейнасці партыі эсэраў, пазней ён звярнуўся да вывучэння пытанняў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў 1917–1921 гг., гісторыі дзяржаўнага апарату ў XIX ст. і інш. [1, 17]. Маючы добры досвед гістарычнага шляху Беларусі і здольнасці як арганізатара навукі, П.І. Брыгадзін падтрымаў прыход у навуку многіх маладых даследчыкаў айчыннай гісторыі. Прафесар У.Ф. Ладысеў да прыходу на сталую працу на кафедру доўгі час займаў розныя пасады ў Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, вышэйшых навучальных установах Мінска. Аднак толькі на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ён змог рэалізаваць цалкам свой патэнцыял даследчыка станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў ХХ ст., пытанняў рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд [17]. Сталым даследчыкам з багатым вопытам кіраўнічай навукова-арганізацыйнай працы

прыйшоў на кафедру прафесар У.М. Міхнюк. Ён займаўся вывучэннем шырокага спектра пытанняў палітычнай гісторыі Беларусі XX ст., гісторыі гістарычнай навукі ў Беларусі. Многія гады працаваў на кафедры па сумяшчальніцтву дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводству Мінстэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь У.І. Адамушка. Ён меў непасрэднае дачыненне да арганізацыі і падрыхтоўкі выданняў зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, даследавання палітычнай гісторыі Савецкай Беларусі міжваеннага перыяду, абмеркавання пытанняў рэстытуцыі культурных каштоўнасцяў Беларусі. За шматтомнае выданне дакументальных матэрыялаў «Белорусские остарбайтеры» У.І. Адамушка ў складзе калектыву быў удастоены Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Некалькі год да выхаду на пенсію па стане здароўя на кафедры працаваў В.С. Касмылёў. Чалавек ён быў надзвычай працавіты. Шмат часу праводзіў у архівах і бібліятэках, удзельнічаў у навуковых праектах, займаўся пытаннямі гісторыі грамадскага руху ў Беларусі ў XIX ст. Да даследавання канфесійнай гісторыі Беларусі., урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. звярнулася ў гэты час В.А. Цяплова. Пэўным падсумаваннем навукова-педагагічнай дзейнасці кафедры на тым этапе стала выданне курса лекцый па гісторыі Беларусі XIX – XX ст. для студэнтаў гістарычных факультэтаў універсітэтаў [4].

З 1999 да 2017 г. загадчыкам кафедры працаваў прафесар А.Г. Каханоўскі, навуковыя інтарэсы якога звязаны з распрацоўкай пытанняў сацыяльнага і этнакультрнага развіцця Беларусі ў XIX – пачатку XX ст., трансфармацыйных змен у беларускім грамадстве ва ўмовах пераходу ад традыцыі да мадэрну [6, 12, 13, 14, 16, 27, 30]. Будучы амаль самым маладым па ўзросце, А.Г. Каханоўскі павінен быў вызначаць дзейнасць кафедры, якая аб'ядноўвала ў той час 4–5 дактароў навук, прафесароў, 10–15 дацэнтаў з уласным багатым навуковым і акадэмічным вопытам. У 2001 г. у склад яе калектыву была ўключана ў поўным складзе ліквідаваная кафедра айчыннай і сусветнай гісторыі (прафесары У.К. Коршук, І.Ф. Раманоўскі, дацэнты Л.М. Кулеш, Л.А. Осіпава, А.І. Котаў, старшы выкладчык Ю.В. Чурмакоў). З іх прыходам актуалізуецца вывучэнне гісторыі палітычных партыі і рухаў на тэрыторыі Беларусі, гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Прафесары У.К. Коршук [10], І.Ф. Раманоўскі ініцыіравалі падрыхтоўку да друку некалькіх пакаленняў навучальных дапаможнікаў па гісторыі палітычных партый і рухаў, зборнікаў дакументаў і матэрыялаў па праблемах правядзення беларусізацыі і інш. З 2000 г. на кафедры працуе дацэнт Г.С. Хадасевіч, у сферу навукова-педагагічных інтарэсаў якой уваходзяць ваенна-палітычныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў XX ст. Апошнія дзесяць год свайго жыцця быў звязаны з працай на кафедры па сумяшчальніцтву акадэмік НАН Беларусі, прафесар М.П. Касцюк. Ён застаўся ў памяці калег як вельмі чулы чалавек і цудоўны даследчык нацыянальна-дзяржаных працэсаў у Беларусі ў XX ст. Шэраг гадоў у якасці сумяшчальнікаў на кафедры працавалі прафесар У.І. Лемяшонак, дацэнты В.В. Яноўская, А.У. Унучак, выкладчыкі І.У. Кабярэц, Н.А. Роцька і інш.

За гады працы А.Г. Каханоўскага ў якасці загадчыка кафедры адбылася ў значнай ступені "змена пакаленняў" у складзе яе калектыву. На кафедру прыйшлі маладыя выкладчыкі А.Б. Багдановіч, А.Л. Дашкевіч, В.С. Макарэвіч, Г.І. Маскевіч, некалькі пазней – А.В. Бурачонак, Н.В. Карповіч, А.М. Максімчык, В.В. Кныш, А.Ф. Паддубская, М.А. Папоў, А.Я. Верамейчык, Л.Ю. Казакоў, І.В. Лебедзева, Г.А. Страленя, Т.М. Шчэрба. За гэты час на кафедры значна павялічылася падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Рэдка якое з пасяджэнняў кафедры праходзіла без абмеркавання кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый саіскальнікаў. Звычайна адбывалася 15–20 такіх навуковых экспертыз у год. Тэматычна даследаванні аспірантаў і дактарантаў звязаны былі пераважна з прыярытэтнымі кірункамі навукова-даследчай працы кафедры, у межах тых традыцый і навуковых школ, якія фарміраваліся тут дзесяцігоддзямі: станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў XX ст., гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, сацыяльная гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX ст., канфесійная гісторыя Беларусі, палітычная гісторыя Беларусі XIX – пачатку XXI ст. Пытанням сацыяльна-прававога становішча і складу дробнай шляхты Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст. прысвечаны дысертацыйнае даследаванне і артыкулы В.С. Макарэвіча [19, 20, 21]. Развіццё прамысловага прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай сферы вытворчасці Беларусі ў 1861–1914 гг. прааналізаваў А.В. Бурачонак [2, 3]. Праваслаўнае духавенства Беларусі як саслоўна-прававую групу вывучае Н.В. Карповіч [11], этнакультурныя працэсы ў Беларусі ў XIX – XX ст. – А.Б. Багдановіч, маладзёжны грамадскі рух у Беларусі ў 30 – 50-х гг. XIX ст. – А.Л. Дашкевіч. Г.І. Маскевіч прааналізавала сацыяльную стратыфікацыю беларускага сялянства ў 60–90-я гг. XIX ст.

[23], В.В. Кныш – месца маргінальных груп у структуры насельніцтва ў другой палове ХІХ ст. Дзейнасці земскіх начальнікаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. прысвечана дысертацыйнае даследаванне Г.А. Стралені [25], лёсу маяратаў на тэрыторыі Беларусі ў ХІХ – пачатку ХХ ст., найперш уладанняў Радзівілаў – даследаванне А.Я. Верамейчык. Гісторыю моды, сацыяльныя працэсы ў Беларусі ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. вывучае А.Ф. Паддубская. Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, міграцыі беларусаў на Каўказ, фарміраванне беларускай дыяспары сталі прадметам даследчыцкіх інтарэсаў А.М. Максімчыка [22]. Гісторыі дзяцінства ў Беларусі ХІХ – пачатку ХХ ст. прысвечаны шэраг навуковых артыкулаў і мяркуемае дысертацыйнае даследаванне І.В. Лебедзевай [18], вывучэнню эвалюцыі саслоўнай групы ганаровых грамадзян у складзе насельніцтва Беларусі ў 30-х гг. ХІХ – пачатку ХХ ст. – Т.М. Шчэрбы [28]. Зусім маладым пайшоў з жыцця М.А. Папоў, які паспеў пакінуць след як таленавіты даследчык канфесійнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы ХІХ ст., аўтар добрай манаграфіі пра дзейнасць мітрапаліта С. Богуш-Сестранцэвіча.

Кафедра актыўна ўдзельнічае ў выкананні заданняў дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, праектаў Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. У 2016–2020 гг. у межах падпраграмы "Гісторыя і культура" ДПНД "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства" выконваюцца дзве тэмы: "Сацыяльныя змены ў грамадстве ва ўмовах капіталістычнай трансфармацыі эканомікі Беларусі (1861 – 1914 гг.)" (кіраўнік – прафесар А.Г. Каханоўскі); "Этна-рэлігійны фактар у дзяржаўным будаўніцтве БССР (1919 – 1939 гг.)" (кіраўнік – дацэнт А.В. Бурачонак). Штогод супрацоўнікі кафедры прадстаўляюць вынікі сваіх даследаванняў на дзесятках навуковых форумаў рознага ўзроўню. Многія з навуковых мерапрыемстваў імі ж ініцыіраваны і праведзены. У іх ліку толькі за апошні час: навуковы круглы стол «Вайна, надзеі, расчараванні: люты 1917-га ў гісторыі Беларусі і Расіі», прысвечаны 100-годдзю падзей Лютаўскай рэвалюцыі (10 сакавіка 2017 г.), навуковы круглы стол «Вопыт савецкай мадэрнізацыі ў Беларусі: да 100-годдзя з дня нараджэння П.М. Машэрава» (26 лютага 2018 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя «Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў ХХ ст.» (29 – 30 лістапада 2018 г.), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Роля універсітэцкай адукацыі і навукі ў сучасным грамадстве: да 100-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта" (26 – 27 лютага 2019 г.) і інш. Вельмі дынамічна развіваецца міжнароднае навуковае супрацоўніцтва кафедры з калегамі з універсітэтаў Расіі, Польшчы, Літвы, Украіны, Вялікабрытаніі, Чэхіі, Германіі і інш. Адным з найбольш знакавых праектаў і магчымасцю прэзентаваць навуковыя дасягненні стала адкрыццё сумеснай з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М.В. Ламаносава магісцерскай праграмы "Гісторыя беларускай дыяспары", да чаго мелі непасрэднае дачыненне таксама і выкладчыкі кафедры.

За амаль стогадовы перыяд вывучэнне мінулага Беларусі ў новы і навейшы час стала вельмі разгалінаваным комплексам навуковых праблем у айчыннай гістарыяграфіі, кожная з якіх мае сваю метадалогію і методыку, традыцыю даследавання. Уклад выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу ў іх вырашэнне дастаткова адчувальны. Склаліся ўласныя традыцыі вывучэння, сфарміраваліся навуковыя школы сацыяльнай гісторыі Беларусі, даследавання дзяржаваўтваральных і ваенна-палітычных працэсаў на тэрыторыі нашай краіны, асабліва гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У апошнія гады ў даследчай працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры, у дапаўненне да названых кірункаў, на першы план выйшлі вельмі надзённыя для сучаснай беларускай гістарычнай навукі пытанні трансфармацыйных змен у беларускім грамадстве, пасляваеннай мадэрнізацыі Беларусі, станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Бригадин П. И., Лукашевич А. М. Минские губернаторы: история власти. Минск: Гос. ин-т упр. и соц. технологий Белорус. гос. ун-та, 2009.
2. Бурачонак А. В. Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі, 1861–1914 гг. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 Мінск, 2012.
3. Бурачонак А. В. Сацыяльны склад прамысловых прадпрымальнікаў Беларусі (канец ХІХ–пачатак ХХ ст.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2011. Вып. 6. С. 20–26.

4. Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / П. І. Брыгадзін, Ю. Л. Казакоў, А. Г. Каханоўскі, У. Ф. Ладысеў, В. В. Пупа, [і інш.] / Беларус. дзярж. ун-т, Гродзен. дзярж. ун-т. Мінск, 2002. Ч. 2 : XIX–XX стагоддзі; рэдкал.: П. І. Брыгадзін [і інш.].
5. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / гал. рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. Т. 2 : Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.) / рэдкал. тома : К І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. 1972.
6. Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя: дапаможнік для студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў / А. Г. Каханоўскі і інш. Мінск : БДУ, 2008.
7. Довнар-Запольский М. В. Народное хозяйство Белоруссии, 1861–1914 гг. Минск : Изд. Госплана БССР, 1926.
8. Дудкоў Д. А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX і пачатку XX стагоддзяў. Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1932.
9. 9. Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі XIX і ў пачатку XX сталецьця. Мінск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1928.
10. Зялінскі П. І., Коршук У. К., Ладысеў, У. Ф. Гісторыя Беларусі (1917–1945): дапаможнік Мінск : БДУ, 2012.
11. Карповіч Н. В. Колькасць і склад хрысціянскага духавенства Беларусі паводле перапісу насельніцтва 1897 г. // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2007. Вып. 2. С. 130–132.
12. Каханоўскі А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск : БДУ, 2017.
13. Каханоўскі А. Г. Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования : науч. сб. / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2012. Вып. 7. С. 80–91.
14. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861– 1914 гг.) / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск : БДУ, 2013. 335 с.
15. Кернажыцкі К. І. Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. Мінск : [б. в.], 1932.
16. Кохановский А. Г., Яновский О. А. Самоопределение белорусской интеллигенции и эволюция ее национально-государственных идеалов: история, традиции и задачи историографии // Интеллигенция и мир. 2008. № 4. С. 46–67.
17. Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.). Мінск : БДУ, 2003.
18. Лебедзева І. В. Сацыяльна-эканамічнае становішча дзяцей Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: крыніцазнаўчы аспект // Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. статей / редкол.: В.А. Гайсёнок (пред.) [и др.]. Минск: РИВШ, 2019. Вып. 19, ч. 1. Ист. науки. С. 266–273.
19. Макарэвіч В. С. Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2008.
20. Макарэвіч В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.). Мінск : БДУ, 2018.
21. Макарэвіч В. С. "Панскі разбор шляхты": абеззямельванне чыншавікоў у другой палове XIX ст. і чыншавая рэформа 1886 г. у Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2011. № 4. С. 3–14.
22. Максимчик А. Н. Население белорусских земель на Северном Кавказе в XIX – начале XX в.: вопросы миграции, расселения и участия в социально-экономических, культурно-образовательных процессах региона // Кавказоведение: опыт, проблемы и перспективы. Мат-лы Всерос. науч. конф. с междунар. участием, посвященной 100-летию известного ученого-кавказоведа, профессора Валентины Павловны Невской / Отв. ред. П.И. Абайханова. Карачаевск: КЧГУ, 2019. С. 279–289.
23. Маскевіч Г. І. Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2010.
24. Пичета В.И. Крестьянское и рабочее движение в эпоху 1905 года // Працы Беларус. дзярж. ун-ту. 1926. № 11. С. 105–127.
25. Страленя А. А. Введение института земских начальников в Минской, Могилевской и Витебской губерниях (конец XIX – начало XX в.) // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. Мінск : БДУ, 2014. № 1. С. 10–14.
26. Фридман М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Минск : Изд-во Бел. гос. ун-та, 1958.
27. Цяплова В. А., Каханоўскі А. Г., Грыбко І. Л. Гісторыя Беларусі XIX ст. : вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-21 03 01 «Гісторыя», Минск : Изд. БДУ, 2004.
28. Щерба Т. Н. К вопросу о предпосылках социокультурных изменений в белорусском обществе в XIX – начале XX вв. // Роль университетского образования и науки в современном обществе : материалы междунар. науч. конф., Минск, 26–27 февр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: А. Д. Король (пред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2019. С. 682–684.

29. Шчарбакоў В. К. Нарыс гісторыі Беларусі = Outline of white-russian history / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі. Мінск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1934. Ч. 1.
30. Kakhanouski A. Modernization processes in Belarus in the second half of the XIX - the beginning of the XX cent.: general trends and national features // Делом и истиной : сборник научных трудов, посвященный 10-летнему юбилею отрудничества между историками Беларуси и Тюбингенского университета = Opere et Veritate : Sammelband von wissenschaftlichen Werken, gewidmet dem 10-jährigen Jubiläum der Zusammenarbeit zwischen Historikern von weissrusischen Universitäten und der Universität Tübingen / под науч. ред. докт. ист. наук, проф. О.Б. Келлер. Минск : РИВШ, 2019. С. 271–283.

УДК 94(476)

## СТАНОВЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ СОВЕТСКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ В ВОСПОМИНАНИЯХ УЧАСТНИКОВ СОБЫТИЙ (ПО МАТЕРИАЛАМ ГОСУДАРСТВЕННОГО АРХИВА НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ СМОЛЕНСКОЙ ОБЛАСТИ)

***Т.И. Тарасенкова***

*Государственный архив новейшей истории Смоленской области, ул. Ленина, 28, 214000, г. Смоленск, Россия, tata-tarasenkova@yandex.ru*

В статье анализируются воспоминания современников и участников событий периода становления белорусской советской государственности, которые хранятся в Государственном архиве новейшей истории Смоленской области. Несмотря на определенную субъективность, они позволяют достаточно достоверно воссоздать картину политического противостояния в обществе и показывают совершенно разное восприятие событий людьми различных политических партий и социальных групп. Документы показывают с новой стороны известные факты и события, которые составили процесс образования Белорусской советской социалистической республики.

***Ключевые слова:*** *белорусская советская государственность; воспоминания современников; Государственный архив новейшей истории Смоленской области.*

## СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ВА ЎСПАМІНАХ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПАДЗЕЙ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА НАВЕЙШАЙ ГІСТОРЫІ СМАЛЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

***Т.І. Тарасенкава***

*Дзяржаўны архіў навейшай гісторыі Смаленскай вобласці,вул. Леніна, 28, 214000, г. Смаленск, Расія,*

*tata-tarasenkova@yandex.ru*

У артыкуле аналізуюцца ўспаміны сучаснікаў і ўдзельнікаў падзей перыяду станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве навейшай гісторыі Смаленскай вобласці. Нягледзячы на пэўную суб’ектыўнасьць, яны дазваляюць адносна дакладна ўзнавіць карціну палітычнага супрацьстаяння ў грамадстве і паказваюць зусім рознае ўспрыманне падзей людзьмі розных палітычных партый і сацыяльных груп. Дакументы паказваюць з новага боку вядомыя факты і падзеі, якія склалі працэс утварэння Беларускай савецкай сацыялістычнай рэспублікі.

***Ключавыя словы:*** *беларуская савецкая дзяржаўнасць; успаміны сучаснікаў; Дзяржаўны архіў навейшай гісторыі Смаленскай вобласці.*

## THE FORMATION OF THE BELARUSIAN SOVIET STATEHOOD IN THE MEMORIES OF PARTICIPANTS OF EVENTS (BY THE MATERIALS OF THE STATE ARCHIVES OF THE MODERN HISTORY OF THE SMOLENSK REGION)

***T. I. Tarasenkova***

*State archives of modern history of the Smolensk region, Lenin Street, 28, 214000, Russia, tata-tarasenkova@yandex.ru*

The article analyzes the memoirs of contemporaries and participants in the events of the formation of Belarusian Soviet statehood, which are stored in the State Archive of Contemporary History of the Smolensk Region. They allow us to recreate the picture of political confrontation in society and show different perceptions of events by people of various political parties and social groups. The documents show from a new perspective the known facts and events that made up the process of formation of the Belarusian Soviet Socialist Republic.